мае глыбокае абгрунтаванне і найбольш блізка стаіць да мастацтва.

Зразумела, мала толькі бачыць прадмет тэатралізацыі, трэба ўмець і арганізаваць яго. Тут важнейшым інструментам выступае вобразнасць, якая складае сутнасць тэатралізацыі і дазваляе паказаць у дзеянні той ці іншы факт, здарэнне, эпізод.

Пытанне аб вобразнасці мастацкай прапаганды не новае. Яшчэ А.В.Луначарскі заклікаў пранізаць мастацтвам усю работу ў масах, выкарыстоўваць усе магчымасці такой яе арганізацыі, каб уздзейнічаць на людзей не разважаннямі, а жывым паказам жыцця ў вобразах. У гэтых словах адлюстроўваецца сутнасць тэатралізацыі, пры якой мы маем магчымасць не расказваць аб якой-небудзь падзеі з жыцця, а паказаць, ажывіць гэтую падзею на сцэне такой, „якая яна была ці ёсць.

Вобразнасць рэальная і мастацкая - гэта аснова тэатралізацыі. Яна дапамагае пабудаваць унутраную сцэнарную логіку і адабраць сродкі мастацкай выразнасці.

Калачова І.І.,
аспірантка

# МЕСЦА ТРАДЫЦЫЙНАГА СЯМЕЙНАГА ВЫХАВАННЯ БЕЛАРУСАЎ У ПАДРЫХТОЎЦЫ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕДАГОГАЎ

Праблема традыцыйнага сямейнага выхавання беларусаў у падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў мае, на нашу думку, выключнае значэнне: згубленыя ўяўленні аб народных сродках, метадах, прыёмах выхавання, адсутнічаюць дасканалыя веды аб гісторыі сям'і, яе радаводзе, генатыпе, абвастраецца "вечны" канфлікт паміж бацькамі і дзецьмі, застаюцца нявырашанымі вельмі вострыя сацыяльныя пытанні. Менавіта грунтоўнае вывучэнне гэтых праблем, распрацоўка метадаў навуковага кіравання з'явамі, якія разбураюць сям'ю і яе традыцыі, з'яўляюцца важнымі задачамі ў падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў.

Чаму патрэбна ведаць традыцыйныя прыёмы сямейнага выхавання, якімі жывілася сям'я?

У беларускай сям'і існавалі традыцыі, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Яны мацавалі сям'ю, яе звычаі. Галоўнай жыццёвай каштоўнасцю сям'і з'яўляліся дзеці. "Нашто той клад, калі дзеткі ідуць у лад", - сведчыла народная мудрасць. Сёння спалучэнне, што "дзеці - гэта кветкі", застаецца вельмі абстрактным. Існуе шмат прыкладаў несправядлівых, абразлівых адносін да дзяцей. Тэрміны "пакінутыя дзеці", "маці-зязюля" і іншыя нарадзіліся ў наш час. Унутрысямейныя і знешнесямейныя адносіны і стасункі ў беларускай сям'і мацаваліся працоўнымі, маральнымі, эстэтычнымі, фізічнымі, разумовымі традыцыямі, якія жывіліся мудрасцю народнай педагогікі. Дзеці выконвалі народныя запаветы, напрыклад такія: "Нельга не працаваць, калі працуюць маці і бацька", "Нельга рабіць таго, што асуджаюць старэйшыя" і інш. Сістэма ўнутрысямейных маральных правілаў і законаў амаль знішчана. Стасункі паміж бацькамі і дзецьмі засноўваюцца па прынцыпу: "Мне патрэбна, я хачу".

У традыцыйнай беларускай культуры чалавек лічыўся асобай толькі тады, калі ён быў працавітым. Бацькі - люстэрка працоўнага выхавання. "Якое семя, такое і племя", "Які куст, такі і адростак". Звычкі выконваць хатнюю працу, дапамагаць старэйшым, нешта майстраваць, рамантаваць у шматлікіх сем'ях з'яўляліся галоўнымі.

У беларускай сям'і вылзялялася традыцыя выхавання дачкі - маці ("Якая дошка, такая і стружка, якая маці, такая і дачушка"), сына - бацькам ("Якое дрэва, такі і клін, які бацька, такі і сын"). Гэта адметнасць праяўлялася ў працоўным выхаванні. З 7-8 год маці вучылі дзяўчынак прасці, шыць, вязаць, вышываць, гатаваць ежу. З 14-15 год пачыналі сабіраць пасаг, які дзяўчынкі рыхтавалі з дапамогаю маці. Бацька вучыў сына галоўным відам мужчынскай працы: араць, сеяць, касіць, рамантаваць надворныя пабудовы і інш. Сучасныя бацькі з-за вытворчай занятасці, бытавых праблем і па іншых прычынах мала ўдзяляюць часу дзецям.

У беларускай сям'і былі вельмі значнымі ролевыя функцыі. Усе ведалі, што бацька - гэта гаспадар, здабытчык. Бацька не толькі патрабаваў парадку ў сям'і, але і сам быў прыкладам добрасумленнасці, справядлівасці. Маці - гэта перш за ўсё выхавацелька сваіх дзяцей. Павага да маці лічылася самым важным маральным запаветам дзяцінства. Выхаванасць дзяцей вымяралася іх уменнем клапаціцца аб старой маці, яе здароўі і дабрабыце. У сучаснай сям'і ролі змяніліся. Часта маці з'яўляецца і гаспадаром, і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здабытчыкам, роля ж выхавацелькі з'яўляецца для яе не заўсёды галоўнай.

Глыбокая павага дзяцей да дзеда і бабы ў сям'і беларусаў - адзін з запаветаў народнай педагогікі. Дзеці павінны былі дагледаць бацькоў да старасці, клапаціцца аб іх і шанаваць. У наш час вельмі частымі з'яўляюцца выпадкі зняважлівых адносін да старых, нежаданне мірыцца з іх патрабаваннямі.

Такім чынам, агульны агляд традыцыйнага сямейнага выхавання і параўнанне з сучасным станам традыцый сямейнага выхавання дае нам падставу сцвярджаць, што сацыяльныя педагогі, якія працуюць з чалавекам, павінны ведаць сямейна-бытавую культуру беларусаў, іх звычаі і традыцыі, народныя прыёмы выхавання.

Прапаную ўвесці ў вучэбныя праграмы наступныя дысцыпліны: "Сям'язнаўства", "Этнапедагогіка", "Методыка арганізацыі і правядзення сямейнага адпачынку".

Баравік Р.І.,
канд.мастацтвазнаўства,
дацэнт

## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ РЭЖЫСУРЫ І МАЙСТЭРСТВА АКЦЁРА НА ПЕРШЫМ КУРСЕ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ

У шэрагу пытанняў, звязаных з тэатральнай адукацыяй, на мой погляд, пытанні прафесійнага выхавання рэжысёра і акцёра з'яўляюцца найбольш надзённымі. Ёсць многа пунктаў гледжання на тое, як патрэбна расціць будучага спецыяліста. Адны лічаць, што людзей гэтай прафесіі наогул не трэба вучыць, таму што яна практычнага характару, а веды дасць само жыццё. Другія прытрымліваюцца процілеглай думкі: будучаму спецыялісту неабходна прывіваць прафесійныя навыкі толькі ў школе. Трэція прытрымліваюцца думкі аб тым, што навучэнцы тэатральнай спецыялізацыі павінны быць свайго роду чаляднікамі ў вопытнага майстра.

Аналізуючы мноства думак і праграм у мастацтве, мы вылучаем сістэму Станіслаўскага, якая адкрыла для тэатральнага мастацтва свету не толькі новыя творчыя накірункі, але і стымулявала ўзнікненне новых методык выхавання людзей тэатральных прафесій. На апошнія мы і арыентуемся.

Праблемы адукацыі ва ўмовах універсітэцкай рэчаіснасці патрабуюць ад нас узняцця да агульнапрафесійнага ўзроўню як студэнтаў, так і выкладчыкаў. Якія ж пытанні тэарэтычнага і практычнага плана паўстаюць перад намі сёння?

Перш за ўсё гэта, вядома, прафесійны ўзровень самога выхавацеля, яго імкненне да тэарэтычнага асэнсавання сваёй практычнай дзейнасці, яе ўдасканальванне. Трэба быць не проста чалавекам з тэатральнай адукацыяй, а таленавітай асобай, майстрам сваёй справы, бо прафесійны лёс будучых спецыялістаў залежыць ад таго, на што і як накіруе ўвагу сваіх вучняў настаўнік. У сувязі з гэтым востра паўстае і пытанне фарміравання агульна-кафедральных педагагічных груп і асабліва іх стварэнне на першых курсах рэжысёрскай спецыялізацыі.

Першы курс для ўчарашняга выпускніка школы з'яўляецца своеасаблівым чысцілішчам, дзе яго чакаюць самыя розныя неспадзяванасці. У працэсе вучобы ён можа адкрыць сябе як асобу, чалавека, які пасвечаны ў таінства мастацтва, альбо расчаравацца і пайсці незразуметым і пакрыўджаным на ўсё жыццё. Вось чаму так важна, каб ужо з першых крокаў студэнты адчувалі сябе самастойнымі творцамі. Дапамагчы ім у гэтым пад сілу толькі тым педагогам, якія разумеюць сілу мастацтва, а не тыя, якіх лёс выпадкова сабраў разам.

Студэнцкая ж група, з'яўляючыся своеасаблівай вучэбна-творчай адзінкай, таксама павінна імкнуцца да вяршынь мастацтва. Авалоданне імі пачынаецца ўжо з першага курса. У сувязі з гэтым паўстае праблема нашых абітурыентаў.

Як і раней, да нас часам трапляюць выпадковыя людзі. Галоўнае для іх - атрымаць дыплом. А для некаторых універсітэцкія гады з'яўляюцца своеасаблівым трамплінам для бізнесу, уладкавання асабістага жыцця і г.д. Таму ўжо на першым курсе неабходна пазбавіцца ад тых, хто аб'ектыўна з'яўляецца разбуральнікам вучэбна-творчага працэсу. Выпадковым людзям у мастацтве ніякая звышсучасная методыка выхавання і нават самы высокі прафесійны ўзровень выкладчыкаў не дапамогуць.

У кожнай галіне чалавечай дзейнасці ёсць свае арыенціры. Для нас яны вызначаюцца таленавіта-прафесійнай асобай выкладчыка, здольнай і працавітай асобай студэнта, сучаснай метадалогіяй выкладання рэжысуры і акцёрскага майстэрства ва ўмовах універсітэцкай рэчаіснасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ